УДК 7.03

# ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ КАЛЕКЦЫІ ЭТНАКУЛЬТУРЫ ВІЦЕБСКАГА РЭГІЁНУ СУПРАЦОЎНІКАМІ КАФЕДРЫ МАСТАЦКАГА АФАРМЛЕННЯ І МАДЭЛЯВАННЯ ВЫРАБАЎ ТЭКСТЫЛЬНАЙ І ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

***Фалей А.У., дац.***
*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Ключавыя словы: экспазіцыя музея, аўтэнтычная этнаграфія, народная культура, экспанаты, этналогія, антрапалогія, Віцебскі рэгіён, тэкстыль.

Рэферат. *Стварэнне музейнага фонду ў навучальнай установе з’яўляецца складанай і адказнай працай. Асноўныя праблемы, з якімі сутыкаюцца стваральнікі музеяў, гэта збіранне фондаў, стварэнне ўмоў для іх захоўвання і атрыбуцыя экспанатаў музея.*

Кафедра мастацкага праектавання і мадэлявання вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці была створана ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці ў 1975 годзе. Праз тры гады ў другім корпусе інстытута, дзе знаходзіліся навучальныя аўдыторыі, з’явіўся музей з калекцыяй аўтэнтычнай этнаграфіі Віцебскага рэгіёну. Пад экспазіцыю была адведзена адна з лепшых аўдыторый 2 корпуса інстытута. У музей прыводзілі гасцей і деманстравалі яго як славутасць кафедры. Чаму, менавіта ў той час, выкладчыкі праявілі столькі ўвагі да матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, да яго працавітасці, прыроднага таленту, любові, з якімі ствараліся рэчы штодзённага прызначэння? Зараз з’яўляецца цікавым і тое, што было размешчана ў музеі, агульны склад калекцыі, яе экспазіцыя і матывы, якімі кіраваліся стваральнікі этнаграфічнага збору.

Музей быў створаны па ініцыятыве супрацоўнікаў кафедры мастацкага афармлення і мадэлявання вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці ў 1978 годзе пад кіраўніцтвам загадчыцы кафедры Маі Фёдараўны Рыбалкінай. Асновай экспазіцыі музея паслужыла калекцыя ўзораў народнай творчасці, экспанатаў, набытых у працэсе экспедыцый па Віцебскай вобласці ў 1975–1980 гадах у Сенненскім, Глубоцкім, Шаркаўшчынскім, Бешанковіцкім, Чашніцкім раёнах.

У экспедыцыях удзельнічалі выкладчыкі кафедры мастацкага афармлення і мадэлявання вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці: загадчыца кафедры Рыбалкіна Мая Фёдараўна, старэйшы выкладчык Філіпенка Аляксей Мікалаевіч, старэйшы выкладчык (зараз дацэнт) Сарокін Віктар Антонавіч, асістэнт Смолін Генадзь Аляксеевіч. Са слоў Смоліна Г. А. вядома, што ён і адзін ездзіў у Гарадоцкі, Шумілінскі, Міёрскі раёны Віцебскай вобласці і прывозіў адтуль рэчы для музея кафедры. Многія з іх сталі пазней экспанатамі музею.

На фота (мал. 1) выкладчыкі кафедры: Сарокін В.А., Філіпенка А.М. (імя жанчыны лічыцца невядомым). Фота передаў у музей кафедры дызайну Сарокін Віктар Антонавіч у 2014 годзе. Як мяркуецца, фатаграфаваў Смолін Г.А.

Асноўнай канцэпцыяй ініцыятыўнай групы супрацоўнікаў кафедры, якія ўдзельнічалі ў зборы калекцыі музея і распрацоўкай яго экспазіцыі, было імкненне забяспечыць выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў матэрыялам для вучэбна-даследчых і навукова-даследчых работ, артыкулаў і публікацый па праблемах этнакультуры, асаблівасцях народнага арнаменту, вышыўкі, набівання касцюма Віцебскага рэгіёну. Тым самым для кафедры, вобразна кажучы, адчыняліся дзверы ў та-

кую галіну навукі, як этналогія і антрапалогія, збіраўся матэрыял для эмпірычнага, а затым і аналітычнага ўзроўню даследавання.



Малюнак 1 – Па Віцебскай вобл. (Шаркаўшчынскі р-н).

Першая экспазіцыя прадметаў беларускай народнай культуры была створана ў памяшканні Віцебскага тэхналагічнага інстытута на кафедры мастацкага афармлення і мадэлявання вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці ў 1979–80 гг. Над экспазіцыяй музея працавалі Сарокін Віктар Антонавіч і Смолін Генадзь Аляксеевіч. Для стварэння экспазіцыі было выдзелена фае 2 корпуса ВТІЛП, вольны ўваход у памяшканне быў зачынены, да ўсіх экспанатаў былі прышытыя этыкеткі з інвентарнымі нумарамі, і інфармацыя па кожнаму экспанату была занесена ў каталог музея кафедры (каталог на сённяшні дзень лічыцца згубленым).

Экспазіцыя музея складалася з розных рэчаў. Пяць касцюмаў былі сабраныя ў меркаваныя строі і размяшчаліся ў зашклёных шафах. Два дзясятка ручнікоў размяшчаліся на металічных кранштэйнах. Каля трох дзесяткаў посцілак былі расkладзены на гарызантальных драўляных подыумах. Каля сарака ўзораў вязаных кручком карункаў і фрагментаў вышыўкі былі аформлены ў драўляных рамах на чырвоным фоне. Фрагменты пазалочанага іканастаса былі размешчаны на сцяне. Дэталі ткацкага станка, калаўрот, чоўны, прасы, самавары, кошыкі і іншыя прадметы размяшчаліся ў зашклёных шафах. Фае было launched ператворана ў 25-а аўдыторыю і там часам праводзіліся заняткі.

Экспазіцыя музея дэманстравала вялікую разнастайнасць беларускага народнага тэкстылю, вышыўкі, карункаў, адзення, якія змяшчалі характэрныя рысы Віцебскага рэгіёну. У памяшканні музея працавалі студэнты, якія вывучалі культурныя традыцыі роднага краю. Рыбалкіна М.Ф. прыцягвала многіх з іх да навуковай працы па вывучэнню характэрных асаблівасцей народнага мастацтва Віцебскай вобласці. Праектуючы касцюмы і тэкстыльныя малюнкі, студэнты вучыліся правільна выкарыстоўваць і адмыслова перапрацоўваць народныя матывы ў сучасныя тэкстыльныя вырабы і мадэлі адзення.

На фота (мал. 2) у навучальным этнаграфічным музеі кафедры (1978г). Прыклады арнаментаў Віцебскай вобласці адлюстраваны ў калекцыі тэкстылю (посцілках), гафтаваных фрагментах і ручніках. Строі на фота (мал. 4) былі размешчаны ў музеі

кафедры таксама ў 1978 годзе (аўдыторыя 25а). Фота зроблена да таго, як у музеі з'явіліся зашклёныя шафы для экспанавання калекцыі. Першымі выставачнымі модулямі былі падрамнікі, абцягнутыя палатном, на якіх замацоўваліся дэталі адзення ці тканыя рэчы. У цяперашні час гэта ўяўляе вялікую цікавасць, паколькі ў выданнях па народнай творчасці з 2000 па 2013 г. інфармацыі па Віцебскай вобласці прадстаўлена вельмі мала.



Малюнак 2 – На занятках у Рыбалкінай М.Ф.

У 1979 годзе калекцыя была прадстаўлена Міхаілу Фёдаравічу Раманюку, які рыхтаваў да выдання альбом “Беларускае народнае адзенне”. Праглядаючы экспанаты музея, ён ахарактарызаваў некаторыя як яркія прыклады беларускай народнай творчасці. Многія рэчы былі Раманюком сфатаграфаваны, і, калі кніга “Беларускае народнае адзенне” з’явілася ў бібліятэках, там з музейнага фонду кафедры можна было знайсці два экспанаты: калядны летні ўбор дзяўчыны, пачатак XX ст., Зубры, Горацкі раён; і жаночую кашулю канца XIX ст., Янава, Сенненскі раён. Фотаздымкі гэтых рэчаў былі зроблены на вачах у студэнтаў, якія знаходзіліся побач з Міхаілам Фёдаравічам падчас яго візіту. Ён прачытаў студэнтам ВТІЛП курс лекцый па беларускаму народнаму касцюму, дэманструючы на слайдах свае фотаздымкі, зробленыя ў экспедыцыях па ўсіх абласцях Беларусі. Віктар Антонавіч Сарокін узгадваў, што адзін з экспанатаў музея быў падораны Міхаілу Фёдаравічу –гэта была спадніца, наўзамен якой ён перадаў для музея кафедры 2 экспанаты.




Малюнак 3 – Экспедыцыі па Віцебскай вобласці

На малюнку 3 зоркамі адзначаны раёны Віцебскай вобласці, у якія выкладчыкі ездзілі ў экспедыцыі. Пры складанні новага спісу і нумарацыі экспанатаў трэба меркаваць, што рэчы могуць быць з гэтых раёнаў. Другіх раёнаў ні В. А. Сарокін, ні Г. А. Смолін у размовах пра экспедыцыі не ўзгадвалі. Паколькі інфармацыя пра былых уладальнікаў экспанатаў з 2003 года лічыцца згубленай, у новым атласе музея гэтыя рэчы падпісваюцца “са збору М. Ф. Рыбалкінай” ці “калекцыя М. Ф. Рыбалкінай”.

УДК: 687.4

# О ПРИМЕНЕНИИ ПОДЕЛОЧНОГО МАТЕРИАЛА В ОФОРМЛЕНИИ ШВЕЙНОЙ ПРОДУКЦИИ

***Щепочкина Ю.А., проф.***
*Ивановский государственный политехнический университет,
г. Иваново, Российская Федерация*

Ключевые слова: дизайн, швейная продукция, ткань, поделочный материал, маркировка.

Реферат. *В последние десятилетия предпочтения людей связаны с потреблением натуральной экологически безопасной продукции, в том числе швейной. Для оформления швейной продукции помимо традиционно используемых печатного рисунка, вышивки, аппликации, широко используется нашивка (приклеивание) на ткань кусочков поделочных материалов.*

*Рассмотрено применение поделочного материала, в частности, янтаря в оформлении швейной продукции, что позволяет создать определенный стиль. Швейная продукция с янтарем позиционируется как полностью соответствующая современной моде.*

*Предлагается швейную продукцию, изготовленную из тканей на основе натуральных волокон, с применением натуральных поделочных материалов, снабжать соответствующей маркировкой.*

*Маркировка, кроме данных о производителе швейного изделия, должна содержать информацию о составе ткани, наименовании натурального поделочного материала, месте его происхождения.*

Поскольку сама мода является отображением общественных явлений, то модные тенденции самозарождаются из общественных ожиданий и потребностей [1].

В последние десятилетия предпочтения людей связаны с потреблением натуральной экологически безопасной продукции, в том числе, швейной. В связи с этим во многих европейских странах, в том числе в Беларуси, появился повышенный потребительский спрос на продукцию, изготовленную из натуральных волокон, преимущественно, льна, хлопка, шерсти. При этом требования потребителей к дизайну и качеству продукции постоянно возрастают [2, 3].

Для оформления швейной продукции, помимо традиционно используемых печатного рисунка, вышивки, аппликации, широко используется нашивка (приклеивание) на ткань кусочков поделочных материалов (перламутра, коралла, жемчуга, янтаря и др.). При этом поделочные материалы применяются как при массовом производстве изделий (одежда, головные уборы и др.), так и при изготовлении авторских работ.

Чем же привлекательно это направление для современных дизайнеров?

Прежде всего, возможностью создать оригинальное, необычное изделие. Наиболее востребовано это направление у дизайнеров, создающих эксклюзивные вещи.